Падтрымай "Вясну" на PATREON

"Назвала супрацоўніка міліцыі склізкім тыпам". Жыхарцы Бярозы далі два гады "хатняй хіміі" за абразу дапоўнена

27.02.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, сілавыя структуры



Валянціна Мядзведзь перад пачаткам судовага пасяджэння. Фота spring96.org

Суд Бярозаўскага раёна 26 лютага разглядаў крымінальную справу ў дачынені да мясцовай жыхаркі Валянціны Мядзведзь, якую абвінавацілі ў абразе супрацоўніка міліцыі пры выкананні ім службовых абавязкаў па артыкуле 369 Крымінальнага кодэкса РБ.

Абвінавачваемая - 45-гадовая жыхарка Бярозы, якая ноччу 17 лістапада 2020 года з дапамогай мабільнага тэлефона размясціла ў Telegram-канале паведамленне, якое змяшчала абразу ў адрас супрацоўніка міліцыі з райцэнтра.

Справу разглядала суддзя **Алена Нямкова**, пракурор – **Ефімаў.**

Пацярпелы – начальнік Інспекцыі па справах непаўнагадовых **Дзмітрый Лішко.**



Дзмітрый Лішко. Скрыншот з відэа

З матэрыялаў следства вядома, што 17 лістапада 2020 года Валянціна Мядзведзь размясціла з дапамогай мабільнага тэлефона у тэлеграм-канале “Бяроза-97” паведамленне, у якім указала, што “Лішко сапраўды гнілы і склізкі тып…”, параўнала яго з паліцаем і дадала яшчэ некалькі абразлівых слоў.

Лінгвістычная экспертыза ад 7 снежня выявіла ненарматыўную форму выказвання, якая мае на мэце абразіць супрацоўніка міліцыі і з’яўляецца публічнай знявагай прадстаўніка ўлады пры выкананні ім службовых абавязкаў.

На допыце ў судзе Валянціна Мядзведзь патлумачыла, што да жніўня 2020 года не ведала Лішко.

“У жніўні ён патэлефанаваў мне ў дзверы і вынес папярэджанне аб недапушчэнні супрацьпраўных дзеянняў, якое я падпісала. Перад гэтым я ў мэсэнджары напісала паведамленне з запрашэннем, каб жадаючыя сустрэліся ў гарадскім парку паразмаўляць па інтарэсах. Я ж 8 год разведзеная, думала можа з кім пазнаёміцца.

Затым 6 верасня я пайшла ў “Еўраопт” за пакупкамі, спынілася каля крамы паразмаўляць з знаёмай. Лішко і яшчэ адзін супрацоўнік падыйшлі і тады Лішко сказаў: “О, і Мядзведзь тут!”. Яны здымалі на відэа падзеі.

Літаральна на заўтра на мяне склалі пратакол за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве, хаця я ў той час была ў краме і суду прад’яўляла чэк пакупкі, прасіла праглядзець відэа, каб пераканацца што ў масавым мерапрыемстве я не ўдзельнічала.

Затым мяне аштрафавалі… Я абурылася – за што?”

Пацярпелы Лішко пад час допыту распавёў, як убачыў абразлівае паведамленне, распавёў пра прадзеі 17 лістапада каля “Еўраопта”, што бачыў там Валянціну на прыпынку каля крамы, папярэджваў яе, каб сыходзіла, але яна не паслухалася.

“Магчыма, пры напісанні абразы ёй кіравалі эмоцыі, аднак нават калі была ўзбуджаная крымінальная справа, Мядзведь не знайшла магчымасці прынесці мне прабачэнні.

Таму я заявіў пазоў аб спагнанні з яе маральнай кампенсацыі ў памеры 2 000 рублёў. Бо яе дзеянііі - гэта падрыў майго аўтарытэта, шмат людзей прачыталі абразлівыя словы ў мэсанджары.”

У судзе былі дапытаныя сведкі - супрацоўнік міліцыі **Грыцэня**, які складаў пратакол на Мядзведзь па арт 23.34 КаАП, суседкі Валянціны **Марыя Сушко і Будрыевіч,** якія характарызавалі яе толькі станоўча, казалі, што розных кампаній дамо не вадзіла, заўсёды была ветлівая і добразычлівая.

У ходзе судовых спрэчак пракурор запрасіў для Мядзведзь **два гады абмежавання волі без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу.** Змякчальныя абставіны – наяўнасць непаўнагадовага дзіця. А таксама прасіў суд задаволіць матэрыяльныя прэтэнзіі пацярпелага.

Валянціна Мядзведзь прасіла суд ўлічыць яе няпростае матэрыяльнае становішча:

“Я не магу ўявіць як Дзмітрый маральна пакутваў менавіта на 2 00 рублёў, хіба можа на 100?”

Ад апошняга слова Мядзведзь адмовілася.

Прысуд: **два гады абмежавання волі без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу,** выплаціць пацярпеламу 1 500 рублёў кампенсацыі за маральныя пакуты.

За абразу і паклёп на ўчастковага ў Інтэрнэце пенсіянерку з Баранавічаў пасадзілі на "хатнюю хімію"

У Баранавічах абвясцілі прысуд 61-гадовай жыхарцы горада, якая абвінавачвалася ў абразе і паклёпе на адрас супрацоўніка міліцыі, паведамляе партал «Першы Рэгіён».

Твитнуть





ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

